Максім Багдановіч “Маёвая песня”

Мэта:пазнаёміцца з кароткімі біяграфічнымі звесткамі пра М.Багдановіча; выпрацоўваць навыкі аналізу пейзажных твораў;вызначыць ролю вобразна-выяўленчых сродкаў у вершы; развіваць навыкі выразнага чытання;спрыяць выхаванню экалагічнай культуры падлеткаў.

Тып урока:вывучэнне новага матэрыялу.

Пленуемы вынік.

Мяркуецца, што вучні будуць ведаць:

-асаблівасці жыццёвага шляху М.Багдановіча;

-вершаваны памер, якім напісаны верш “Маёвая песня”;

-тэму і асноўную думку верша;

Будуць умець:

-вызначаць мастацкія сродкі выразнасці;

-знаходзіць сувязь паміж прыродай і чалавекам;

Змогуць:

-выразна чытаць верш;

-параўнаць творы паэтычныя, музычныя і пейзажныя.

Эпіграф:

У матылька не гады, а імгненні, - і яму хапае часу.

Р.Тагор

Ход урока.

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап.**

*Настаўнік.* За акном у нас каляндарная зіма. На вуліцы ляжыць снег. У паветры мітусяцца сняжынкі. Праз некалькі тыдняў прыйдуць да нас навагоднія святы. Усе ў чаканні нечага незвычайнага. І сапраўды, цуд адбудзецца, толькі не некалі, а зараз. І сёння мы з вамі перанясемся ў цудоўны вясновы дзень, station паназіраем за абуджанай прыродай.

- У мяне для вас заданне: злучыце магчымае з немагчымым. Прыдумайце сказ са словамі “зіма” і “матылёк”. (Снежнай зімой мне падабаецца разглядаць калекцыю матылькоў. Зімой не хапае яркіх вобразаў, таму я бяру альбом і малюю матылька.)
- А што вам вядома пра матылькоў? З якімі павер’ямі вы сустракаліся наконт гэтых яркіх насякомых?

*Індывідуальнае паведамленне вучня.*

Існуе мноства павер’яў, звязаных з матылькамі.

| | Матылёк | Павер’е |
|---|---|---|
| 1 | Злавілі матылька. | Загадайце жаданне і адпусціце, тады жаданне споўніцца. |
| 2 | Матылёк сеў на руку. | Жыццё чалавека будзе гарманічным і спакойным. |
| 3 | Матылёк на плячы. | Сустрэча з ворагам або новае знаёмства. |
| 4 | Матылёк сеў на галаву. | Здзяйсненне задуманага або новае |

| | | |
|---|---|---|
| | | падарожжа. |
| 5 | Б’ецца ў аконную шыбу. | Выпусціце на волю – і ўвесь негатыў адыдзе ад вас. |
| 6 | Высаджвайце на балконе і ў садзе кветкі. | Насякомыя аберагаюць дом ад бяды і няшчасця. |

*Настаўнік.*

- Ці згодны вы з меркаваннем, што трэба лавіць гэтых цудоўных насякомых толькі дзеля таго, каб загадаць жаданне? (Не, таму што крыльцы ў іх вельмі слабыя і мы можам пашкодзіць матыльку.)
- З’яўленне матылькоў на вуліцы – гэта адзнака якой пары года? (Наступіла вясна або лета.)
- Як вы думаеце, чаму я прапанавала размову пра матылькоў на пачатку ўрока? (Гэта можа быць тэмай урока; матылёк – галоўны вобраз твора, з якім мы будзем знаёміцца на ўроку; матылёк – сімвал чагосьці.)

**II. Аперацыйна-пазнавальны этап.**

*Настаўнік.* І сапраўды, сёння на ўроку мы пазнаёмімся з вершам Максіма Багдановіча “Маёвая песня” і адзначым: ці існуе сувязь паміж матыльком і паэтам?

1. *Настаўнік чытае верш або слухаем аўдыязапіс.*
   (ссылка https://yandex.by/video/)
2. *Праца з вершам. Павобразны аналіз паэтычнага твора.*
   - Якія зрокавыя карціны паўстаюць перад намі, калі мы слухаем верш? (вішня ў квецені, сінякрылы матылёк, сонца залатое, тонкія зёлкі, чарот ля ракі, паэт)
   - Якая зрокавая карціна дапамагае выявіць, што перад намі сапраўды вясна? (вішня ў квецені)
   - Якой паўстае вясна ў вершы Максіма Багдановіча?(сапраўдная вясна, цёплае надвор’е, цвітуць вішні, свеціць яркае сонейка, лятаюць матылі, павявае ціхі ветрык)
   - І што мы чуем ў гэты час? (песню). Гэтая песня гучыць у чыімсьці выкананні, ці яна рвецца з душы лірычнага героя? (яе адчувае лірычны герой, гледзячы на прыгажосць наваколля)
   - Якім нам уяўляецца лірычны герой? (чалавекам назіральным, пачуццёвым, мастаком слова, неабыякавым да музыкі)
   - Чаму гэтую песню вясны, якая льецца з душы, паэт параўноўвае з гімнам?
   - Што такое гімн? І дзе мы сутыкаемся з гэтым паняццем?

   Гімн – урачыстая песня ў гонар якога-небудзь героя, выдатнай падзеі або дзяржавы. (Запіс у сшытку, праца з літаратуразнаўчым слоўнікам).

- Які мастацкі сродак выразнасці аўтар выкарыстоўвае пры характарыстыцы гімна вясне? (эпітэт “ціхі, ясны гімн вясне”). Якая яго роля? Якая роля вясны сярод іншых пор года?

*Настаўнік.* Калі мы гаворым пра поры года, то вясна нам уяўляцца маладой, зялёнай, чыстай, жыццё толькі нараджаецца. І гэта гімн не проста вясне, а гімн у гонар жыцця, у гонар прыгажосці, у гонар еднасці чалавека з прыродай.

3. *Настаўнік. Давайце звернемся да радкоў верша і вызначым, якія сродкі мастацкай выразнасці аўтар выкарыстоўвае ў творы і якая іх роля.*

| Мастацкія сродкі | Прыклады | Роля ў тэксце |
|---|---|---|
| Эпітэты | Па-над белым пухам вішань; шпаркі, лёгкі сінякрылы матылёк; у струнах сонца залатых; ціхі, ясны гімн вясне; звонкі вецер; дрыжачыя крылы; тонкія зёлкі; раздольны, вольны свет | Дапамагаюць уявіць прыгажосць веснавога дня, яго шматгалоссе, насычанасць, замілаванасць |
| Параўнанні | Сінякрылы матылёк быццам сіні аганёк; | Кантраст паміж белым колерам вішань і матыльком; наколькі ён яркі, жывы, адметны,нясе цяпло, радасць |
| Метафары | Матылёк б’ецца, уецца; звоніць крыламі; песня ліецца хваляй; чарот шуміць; песня рвецца і ліецца; зыкі ляцяць, дрыжаць, звіняць; | Паказаць, што навакольны свет жывы, непаўторны; трэба прыслухацца да яго; |
| Алітарацыя | Паўтарэнне гукаў [дз’] [ц]-[ц’] [з]-[з’] [с]-[с’] [ж] [ш] [р] [л’] [в]-[в’] | Усё жывое славіць вясну; мяккасць, разнастайнасць навакольнага свету, узмацненне гукавой выразнасці |
| Дзеясловы | Б’ецца, уецца, ліецца, звіняць, дрыжаць, рвецца, ляцяць… | Рух у прыродзе, змены, узрушанасць ад прыгажосці |
| Адкрытыя пытанні;рытарычнае пытанне | 3,4 страфа;<br>6 страфа | А што я адкажу на гэтае пытанне? А што я бачу? Што я чую? |

- Чаму ў апошняй страфе лірычны герой сумняваецца, что адчуць прыгажосць навакольнага свету даецца не кожнаму. Чаму ён задаецца пытаннем, что пачуць песню можа толькі сам паэт?
- Якая асноўная думка гэтага верша? (паказаць не толькі прыгажосць прыроды, яе непаўторнасць, яе дынамічнасць, а ў першую чаргу звярнуць нашу ўвагу на тое, каб мы, людзі, заўважалі гэты дзівосны свет, берагли яго, таму што як тыя крыльцы ў матылька, ён вельмі ломкі, крохкі)

4. *Настаўнік*. Верш Максіма Багдановіча "Маёвая песня" – адзін з лепшых пейзажных твораў беларускай паэзіі, жывапіс словам і музыка ў слове. Нездарма эпіграфам да яго ўзяты радок з верша французскага паэта з беларускімі каранямі Поля Верлена: "Музыка перш за ўсё…"

- Як вы думаеце, што надае вершу рытмічнасць? (раўнамернае чаргаванне націскных і ненаціскных складоў)
- Якім вершаваным памерам напісаны верш? (харэй)
  *Б'е'цца, ўе'цца шпа'ркі, лё'гкі…*
  —'— |—'— |—'— |—'— |
- Што надае такі памер вершу? (меладычнасць, танцавальнасць)
  *Настаўнік.* Давайце праслухаем песню Ігара Паліводы на тэкст гэтага верша і выкажам сваё ўражанне ад музычнага твора. (ссылка https://yandex.by/search/?text=маёвая+песня+слушать&lr=200891&clid=9582&src=suggest_T)

- Мы з вамі праслухалі верш, праслухалі песню. Давайце яшчэ звернемся да жывапісу і разгледзім карціну Э. Рымаровіча "Вясна на возеры Баторына".

5.*Творчасць. Параўнальная табліца "Словамі, фарбамі…"*

| Творы | Каляровая палітра. Уражанне | Інтэрпрэтацыя | Ацэнка |
|---|---|---|---|
| Верш "Маёвая песня" | Сінякрылы матылёк, залатое сонца,сіняя рака,зялёны колер зёлак. Адчуваецца цеплыня, раздолле, насычанасць жыццём. | Пераўтвары верш у малюнак, параўнай малюнак з вершам, зрабі высноўу. (папераджальнае заданне да ўрока) | Што ёсць карыснага для жыцця? Магчымасць назіраць, супастаўляць, захапляцца, праявіць свой талент. |
| Э.Рымаровіч "Вясна на возеры Баторына". | Зялёна-салатавы колер травы, блакітны колер вады і неба, белы колер квітнеючага | Ствары ўласны верш на адпаведную тэму. Ці цяжка быць паэтам? | Што ёсць карыснага? Магчымасць фантазіраваць, дабаўляць,адчуваць, |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | дрэва. Адчуваецца лёгкасць, спакой, бязмежнасць, цішыня. | (папераджальнае заданне) | параўноўваць, тварыць. |

6. *Настаўнік.* Хто б ні быў перад намі:паэт, мастак, кампазітар – усе яны майстры сваёй працы.

- Якім паўстае перад намі Максім Багдановіч? (таленавіты пісьменнік, улюбёны ў дзівосны свет прыроды, зачараваны гэтым дзівосным светам, шматгранны чалавек, які чуе музыку ў паўсядзённасці)

*Індывідуальнае паведамленне вучня.*

9 снежня 1891года – дзень нараджэння Максіма Багдановіча.

Калі мы глядзім на яго дзіцячыя фотаздымкі, то заўважаем, што апрануты ён у дзявочую сукенку. У даўнія часы лічылася, што такім чынам можна засцерагчы хлопчыка ад цяжкага лёсу. Але, на жаль, Максім Багдановіч пражыў кароткае жыццё, усяго 25 гадоў.

Нарадзіўся ў Мінску ў сям'і настаўнікаў, у 1892 годзе сям'я пераехала ў Гродна. Праз чатыры гады памерла маці і бацька пісьменніка прыняў рашэнне пераехаць у Ніжні Ноўгарад да сваякоў.

Пачатковую адукацыю Максім Багдановіч атрымаў дома. У дзесяць гадоў пачаў пісаць вершы па-беларуску, прытым што беларускую мову пісьменнік вывучыў самастойна. Ад маці, якая цудоўна іграла на фартэпіяна, пераняў здольнасць да музыкі.

Верш “Маёвая песня” ўваходзіць у зборнік “Вянок”, які быў выдадзены ў Вільні. Гэта адзіны прыжыццёвы зборнік паэта. Вершы паэта вельмі мілагучныя, меладычныя.

У сям'і пісьменніка была спадчынная хвароба на сухоты. Не абышла яна бокам і Максіма Багдановіча. Каб паправіць сваё здароўе, ён едзе ў Крым, дзе 25 мая 1917 паэта не стала.

7. *Творчасць. Стварэнне асацыяцый. Метад “Алфавіт”*

**Б** – Богам дадзены
**А** – адкрытасць
**Г** – гасціннасць
**Д** – дабрыня
**А** – адукаванасць
**Н** – непаўторнасць
**О** – одум
**В** – вечнасць
**І** – імгненне
**Ч** – чалавечнасць

**М** – музыка
**А** – аганёк
**К** – кветка
**С** – сімвал
**І** – імкненне
**М** – мужнасць

8. *Настаўнік.*

- Давайце звернемся да эпіграфа і патлумачым яго значэнне.
- Ці можна параўнаць жыццё Максіма Багдановіча з жыццём матылька?

(Максім Багдановіч – гэта і ёсць сінякрылы матылёк. Яркі, тонкі, шматфарбны, пражыў кароткае жыццё, але яму хапіла часу пакінуць пасля сябе цудоўныя творы)

III. Рэфлексія. Паслухайце, калі ласка, прытчу.

Жыў на свеце адзін мудрэц. Многа чаго ведаў, усім даваў парады. І вось адзін зайздроснік задумаў зняславіць яго. Вырашыў ён пайсці на луг, злавіць матылька і схаваць між далоняў.

Усміхаючыся, падышоў да мудраца і запытаў:

-Скажыце, які матылёк у мяне ў руках: жывы ці мёртвы?

Мудрэц, не гледзячы на рукі, адказаў:

-Усё ў тваіх руках.

- Як вы разумееце словы мудраца?

IV. Дамашняе заданне. Вывучыць верш “Маёвая песня” на памяць.

Літаратура

1. Беларуская літаратура: вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. установ. з беларус. і рус. мовамі навучання : М.А.Лазарук, Т.У.Логінава, Г.А.Суханава. – Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2017.